ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
3
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 29 (1405)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ!

«Гэта было сапраўднае свята!»

ПРАДСТАЎНІКІ больш як 70 краін свету вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна. І сам універсітэт — як маленькая планета. Тут можна пачуць самыя розныя мовы, на святах здзівіцца экзатычным нацыянальным касцюмам, тэмпераментным танцам і меладычным песням. Каб бліжэй пазнаёміцца з культурай краін, зблізіцца з самімі студэнтамі, ва універсітэце праводзяцца вечары дружбы, інтэрнацыянальныя суботнікі, сумесныя паходы і экскурсіі, працуе клуб «Палітыкус». Зараз можна назваць яшчэ адну форму работы — прыём кіраўнікоў маладзёжных саюзаў замежных студэнтаў, што вучацца ў БДУ, камітэтам камсамола універсітэта. Такі прыём адбыўся 28 кастрычніка ў гонар дня нараджэння камсамола.

Тут сабраліся прадстаўнікі 11 краін: Кубы, ЧССР, ГДР, СРВ, Эфіопіі, НДРЙ, Алжыра, Ірака, Афганістана, Гвінеі-Бісау, Грэцыі. Гэта быў не сход, не пасяджэнне, а хутчэй за ўсё гутарка. Яна атрымалася па-таварыску шчырая, прынцыповая. Гаварылі пра агульнае і рознае ў праблемах Ленінскага камсамола і маладзёжных саюзаў іншых краін. Лідэры маладзёжных саюзаў пагаджаліся з поспехамі камсамольскай арганізацыі універсітэта, з тым, што ў яе ёсць чаму павучыцца. Але адзначылі і недахопы. У прыватнасці, узнялі праблему выхаваўчай работы ў інтэргрупах, выказаліся за больш строгі падыход выкладчыкаў да замежных студэнтаў. Выступалі многія, бо кожнаму было што сказаць, хацелася падзяліцца сваімі думкамі, меркаваннямі. Сакратар камітэта камсамола Аляксандр Казулін расказаў аб задачах камсамольскай арганізацыі універсітэта.

У канцы сустрэчы студэнтка з ЧССР Алена Машланава адзначыла, што хацелася б, каб інтэрнацыянальная работа праводзілася на такім узроўні, як сённяшняя сустрэча. Думаецца, што яе словы ў нейкай ступені ацанілі значэнне прыёму. Ён павінен стаць яшчэ адным крокам на шляху дасягнення большага ўзаемаразумення паміж студэнтамі розных краін.

Ала Нежавец, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце, пад уражаннем сустрэчы сказала:

— Гэта было сапраўднае свята!

С. ВЯРОХА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

СЛАВА ВЯЛІКАМУ КАСТРЫЧНІКУ, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ Ў ГІСТОРЫІ ЧАЛАВЕЦТВА — ЭПОХУ ПЕРАМОГІ САЦЫЯЛІЗМУ І КАМУНІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ЛІТАРАТУРНАЯ СТАРОНКА

ТВОРЧАЯ ЛАБАРАТОРЫЯ ПАЭТА

праводзіць калектыў народнага ансамбля танца «Крыжачок». Яго ўдзельнікі рыхтуюцца да выступлення на святочным канцэрце, прысвечаным 66-й гадавіне Вялікага Кастрычніка, які адбудзецца напярэдадні свята ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры оперы і балета.

М. ЛАПША,
кіраўнік народнага ансамбля танца «Крыжачок».

АДКРЫТЫ

новы універсітэцкі санаторый-прафілакторый на 100 месц. Студэнты і выкладчыкі тут змогуць цудоўна адпачыць і папраўіць свё здароўе.

П. ЛАПЦЁНАК,
намеснік старшыні прафкома.

НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ

Савета і партыйнага камітэта універсітэта з паведамленнем аб рабоце НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі выступіў дырэктар інстытута прафесар А. Ф. Чарняўскі. Ён спыніўся на станоўчым у арганізацыі работы і адзначыў недахопы, што патрабуюць неадкладнага вырашэння.

На Савеце былі ўручаны вышэйшыя ўзнагароды Савецкага камітэта ветэранаў вайны — Ганаровыя вымпелы і Памятныя медалі, — якіх удастоены арганізацыя ветэранаў вайны універсітэта і музей гісторыі за актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным і інтэрнацыянальным выхаванні студэнцкай моладзі.

З. АЛЯКСАНДРАВА,
наш кар.

У ДАПАМОГУ

спецыялістам народнай адукацыі магазін «Метадычная кніга» праводзіць папярэдні заказ на плакаты, якія будуць выпускацца ў наступным годзе і літаратуру грамадска-палітычнай тэматыкі. Тут можна афарміць таксама падпіску на вузкаспецыяльныя выданні па педагогіцы.

Г. ЧУДЗЯНКОВА.

НА ПЕРШЫХ ЗАНЯТКАХ

вучобы інтэрактыву універсітэта перад прысутнымі выступіў прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа. Ён пажадаў членам інтэрактыву наладзіць цесныя сувязі і таварыскія адносіны са студэнтамі з розных краін свету, знайсці новыя цікавыя формы работы.

В. СВЯТЛАНАВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

КУРСАМ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ І ПРЫНЦЫПОВАСЦІ

У АБСТАНОЎЦЫ высокай патрабавальнасці і прынцыповасці прайшла III партыйная справаздачна-выбарная канферэнцыя універсітэта. Камуністы падвялі вынікі сваіх намаганняў за справаздачны перыяд, акрэслілі праблемы, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

У рабоце партканферэнцыі прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін, інструктар ЦК КПСС А. І. Владзіміраў, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР А. П. Шапашнікава, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. М. Мяшкоў, намеснік загадчыка аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ В. П. Кузьмянкоў, загадчык сектара аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ В. І. Пракошын, інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ Л. М.

Заканчэнне на 2-й стар.).

У час работы канферэнцыі.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

Курсам патрабавальнасці і прынцыповасці

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.).**

Давыдзенка, сакратар Мінскага АК КПБ А. І. Жыльскі, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Мінскага ГК КПБ І. Ф. Клімаў, першы сакратар Маскоўскага РК КПБ Б. А. Саўчанка, намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР С. А. Малевіч.

На канферэнцыі выступілі сакратар партбюро ФПМ М. М. Федзяня, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі А. М. Шырокаў, загадчык кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў У. К. Коршук, прарэктар універсітэта А. В. Шарапа, студэнт юрфака М. А. Раманоўскі, дырэктар НДІ ПФП А. Ф. Чарняўскі, старшыня прафкома супрацоўнікаў Э. В. Шастаковіч, рэктар універсітэта Л. І. Кісялеўскі, старшыня камісіі кантролю за дзейнасцю адміністрацыі Г. Л. Шчукін, сакратар камітэта камсамола А. У. Казулін, старшыня камітэта народнага кантролю А. С. Каспяровіч, дырэктар ІПК А. Д. Малочка, сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

Прапаноўваем у пераказе даклад парткома, з якім выступіў М. Г. Елісееў.

ТРЫ мінулыя гады былі для універсітэта, як і для ўсёй краіны, азнаменаваны напружанай працай, важнейшымі палітычнымі падзеямі ў жыцці партыі і Савецкай дзяржавы. Змест гэтага часу вызначаецца падвядзеннем вынікаў мінулай пяцігодкі, падрыхтоўкай, рэалізацыяй павышаных сацыялістычных абавязацельстваў насустрач XXVI з'езду КПСС. Потым калектыў універсітэта працаваў над выкананнем гістарычных рашэнняў XXVI з'ездда партыі, Пленумаў ЦК КПСС. У кантэксце барацьбы за рэалізацыю гэтых важнейшых рашэнняў калектыў універсітэта і яго авангард — партыйная арганізацыя — вырашалі задачы, намечаныя XXIX з'ездам Кампартыі Беларусі, Пленумамі ЦК КПБ, Мінскага абласнога і гарадскога, Маскоўскага раённага партыйных камітэтаў, выконвалі пастанову II справаздачна-выбарнай партыйнай канферэнцыі універсітэта.

У справаздачным перыядзе калектыў рыхтаваўся і дастойна сустрэў 60-годдзе ўтварэння БДУ, што было важна не толькі для нашага калектыву, але і для грамадскасці рэспублікі, яе вышэйшай школы і навукі.

У дзейнасці партарганізацыі была яшчэ адна асаблівасць. Мінулая партканферэнцыя выбрала партком у расшыраным саставе, і з сакавіка 1981 года партком стаў функцыяніраваць на правах райкома ў пытаннях уліку камуністаў, прыёму ў партыю, разгледжання персанальных спраў. Гэта ўсклала на партком дадатковыя абавязкі. Ішло назапашванне вопыту работы ў расшыраным саставе і ў сувязі з новым статусам парткома.

Далей дакладчык падкрэсліў, што наш універсітэт, на погляд партыйнага камітэта, спраўляецца з ускладзенай на яго высокай місіяй — рыхтаваць высокакваліфікаваныя, ідэйна перакананыя кадры для народнай гаспадаркі, навукі, асветы і культуры, кадры ідэалагічных работнікаў.

Сапраўды, універсітэт падрыхтаваў каля 70 тысяч спецыялістаў. У ім вучыліся прыкладна каля 5 тысяч замежных грамадзян — пераважна з сацыялістычных дзяржаў і дзяржаў, якія развіваюцца.

З універсітэта выйшлі ці працуюць у ім звыш 300 лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўных прэмій СССР, БССР, Ленінскага камсамола, заслужаных дзеячаў навукі, тэхнікі, вышэйшай школы, культуры, настаўнікаў, 5 Герояў Савецкага Саюза, 9 Герояў Сацыялістычнай Працы.

Партыйная арганізацыя складаецца з 24 цэхавых з правам пярвічнай, якія аб'ядноўваюць на сённяшні дзень 1450 членаў КПСС і 56 кандыдатаў у члены КПСС. Буйнейшымі партарганізацыямі з'яўляюцца арганізацыі юрыдычнага, гістарычнага факультэтаў і ІПК. Наш калектыў і яго партарганізацыя — шматнацыянальная дружная сям'я.

За справаздачны перыяд партком шмат зрабіў для павелічэння партыйнай праслойкі выкладчыкаў - грамадазнаўцаў. Прынята ў партыю 12 чалавек, што складае 35,3 працэнта ад агульнай колькасці прынятых у партыю выкладчыкаў. Зараз членаў партыі на гэтых кафедрах больш за 90 працэнтаў. Будучаму парткому патрэбна прадоўжыць гэтую работу.

ПОТЫМ дакладчык адзначыў, што пытанні вучэбнай работы былі пастаянна ў полі зроку партыйнага камітэта, яго бюро і вучэбнага аддзела. Можна сказаць шмат добрых слоў аб рабоце ўсіх сектараў вучэбнага аддзела партыйнага камітэта, але партыйны падыход — гэта перш за ўсё аналіз канкрэтных рэзультатаў. Таму партком лічыць сваім абавязкам інфармаваць партыйную канферэнцыю аб недахопах у вучэбнай рабоце. Да прыкладу, вялікая колькасць адлічэнняў з універсітэта студэнтаў, у асноўным малодшых курсаў. У нейкай ступені гэта не вельмі добрая характарыстыка эфектыўнасці і якасці нашай работы па прыцягненню да паступлення ва універсітэт таленавітай моладзі, па конкурснаму адбору абітурыентаў, па арганізацыі вучэбнай работы, і ў першую чаргу, на малодшых курсах, работы па адаптацыі.

Знізілася паспяховасць па грамадскіх навуках на завочным і вячэрнім аддзяленні. Некаторыя нежаданыя змены назіраюцца і на дзённым аддзяленні: працэнт паспяховасці па грамадскіх навуках на «добра» і «выдатна» панізіўся за шэсць гадоў прыкладна з 90 да 82 працэнтаў. Гэты ж паказчык на вячэрнім і завочным аддзяленнях быў невысокі і раней (50 працэнтаў), а зараз стаў яшчэ ніжэй (43—45 працэнтаў).

Гаворачы аб вучэбнай дысцыпліне ва універсітэце ўвогуле, нельга не адзначыць, што за апошнія шэсць гадоў знізілася наведванне лекцый.

Невысокая, калі не сказаць дрэнная, паспяховасць на вячэрнім аддзяленні, што ў нейкай ступені вызначаецца дрэнным наведваннем заняткаў. Тут відавочны прагал у арганізацыйным плане і ў плане захавання патрабаванняў вышэйшай школы, і ў плане ўзаемадзеяння з арганізацыямі, у якіх працуюць нашы студэнты-вячэрнікі.

Парткому і рэктарату, дэканатам і партбюро, вучэбнаму аддзелу тэрмінова патрэбна выправіць становішча.

Тое, што на першы план у дакладзе вынесены недахопы, не закрэслівае вялікіх намаганняў калектыву універсітэта, яго партарганізацыі, камуністаў і беспартыйных. Ва універсітэце шмат робіцца для паляпшэння якасці выкладання. За 1980 — 1982 г. г. выдадзена з грыфамі міністэрства звыш 70 вучэбнікаў і 629 вучэбна-метадычных дапаможнікаў. Узмацняецца ўвага ў гэтай галіне да студэнтаў, якія вучацца без адрыву ад вытворчасці. Калі прасачыць у дынаміцы, то ў выданнях бачна стойкая тэндэнцыя росту.

ДАЛЕЙ дакладчык спыніўся на пытанні развіцця навуковых даследаванняў і пачаў з прыватных палажэнняў даклада на мінулай партканферэнцыі. Тады гаварылася: «пакуль нізкі ўзровень эканамічнай эфектыўнасці навуковых даследаванняў НДІ ФХП», што ён «складае толькі 16 кап. на 1 рубель затрат». Як папрацаваў калектыў інстытута, яго камуністы ў апошнія тры гады? Сёння можна сказаць, што становішча рэзка змянілася. Вось даныя: на 1 руб. затрат атрымана 3 руб. 60 кап. Па ўсіх паказчыках стабільны рост. Выдатна, што інстытут усё больш і больш вырашае праблем для рэспублікі.

Другі прыклад і па другому інстытуту — НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі. Гэты інстытут, робячы многае ў самых сучасных галінах навукі, не забывае і пра Харчовую праграму. Ён завяваў Пераходны Чырвоны Сцяг МінВНУ СССР і ЦК галіновага прафсаюза. Разам з тым, патрэбна сказаць, што тут яшчэ існуюць праблемы ўзаемасувязі з кафедрамі, факультэтамі. Ёсць яшчэ адно пытанне: неабходны большы паварот інстытута да праблем рэспублікі.

Вось агульная карціна стану навукі. Эканамічны эфект ад навуковых распрацовак у 1979 годзе склаў 8,5 млн. руб. За 1980 год эфектыўнасць была 22,3 млн. руб. і ў наступныя гады па 23,6 і 22,4 млн. руб. адпаведна.

У 1981 і 1982 гадах на 1 руб. затрат атрымана больш за 2 руб. прыбытку. Паказчык добры, але ніжэй за міжвузаўскі. Навуковым падраздзяленням патрэбна яшчэ шмат папрацаваць. Парткому патрэбна трымаць у полі зроку пазіцыю эканамічнай эфектыўнасці.

Бюро парткома належную ўвагу ўдзяляла сувязі навукі з вытворчасцю, у прыватнасці, упершыню за ўвесь час існавання вучэбна-навуковага-вытворчага аб'яднання БДУ — ВА «Інтэграл» было праведзена сумеснае пасяджэнне бюро парткома. У справаздачны перыяд па лініі парткома разгорнута работа па аказанню ВА «Інтэграл» дапамогі ў ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай рабоце.

Гаворачы аб падрыхтоўцы кадраў, навуковым супрацоўніцтве, патрэбна адзначыць, што нашы кадры на ВА «Інтэграл» добра зарэкамендавалі сябе. Аднак, у рабоце вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання адчуваецца яшчэ недастатковае кіраўніцтва з боку рэктарата і дырэкцыі «Інтэграла».

Зараз ва універсітэце заключана і рэалізуецца звыш 300 дагавораў аб супрацоўніцтве з навуковымі і іншымі ўстановамі.

Сур'ёзная работа праведзена універсітэтам у канцэнтрацыі навуковых сіл для вырашэння важнейшых фундаментальных і прыкладных навуковых праблем. Важнейшая тэматыка складае зараз 77,7 працэнта — 351 тэма (63,3 працэнта ў 1980 г.).

Рэзультаты навуковых даследаванняў адлюстроўваюцца ў манаграфіях. Тут адносна ўстойлівыя паказчыкі.

Толькі за два першыя гады пяцігодкі атрымана 382 пасведчанні на вынаходніцтвы, ці 60 працэнтаў ад паказчыкаў усёй мінулай пяцігодкі. Намнога складаней з укараненнем нашых вынаходніцтваў.

Наш універсітэт шырока прапагандуе свае дасягненні, імкнецца зрабіць іх здабыткам вытворчасці. На выстаўках, у тым ліку за мяжой, экспанавалася 155 прылад і тэхналогій, атрымана 84 узнагароды.

Нельга вымераць па многіх навуковых дасягненнях сацыяльны і палітычны эфект. Гэта датычыцца даследаванняў, якія вядуцца нашымі географамі, хімікамі, грамадазнаўцамі, асабліва па праблематыцы Харчовай праграмы СССР. Усяго ў плане рэалізацыі Харчовай праграмы ва універсітэце выконваецца 18 тэм НДР.

Так, НДІ ПФП распрацаваны экспрэсныя метады аналізу малака і малочных прадуктаў, а таксама апаратура для іх рэалізацыі.

На хімічным факультэце і НДІ ФХП распрацаваны метады радыяцыйнай мадыфікацыі грубых кармоў (саломы і інш), вызначэння пасяўных якасцей насення збожжавых культур.

У галіне грамадскіх навук работа вучоных універсітэта накіравана на рашэнне актуальных пытанняў, звязаных з узрошымі задачамі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, духоўнага развіцця грамадства, з праблемамі камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Апублікаваны манаграфіі кафедр марксісцка-ленінскай філасофіі і ІПК «Сацыяльныя перспектывы развітога сацыялізму», кафедр палітэканоміі «Абагуленне вытворчасці і рост дабрабыту працоўных», манаграфія «Ідэалы і нормы навуковага даследавання» пад рэдакцыяй прафесара В. Сцёпіна, выходзіць у свет манаграфія кафедр гісторыі КПСС прыродазнаўчых і гуманітарных факультэтаў «Фарміраванне камуністычнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі ў працэсе выкладання гісторыі КПСС», манаграфіі гісторыкаў па праблематыцы XXVI з'езда КПСС.

Калектыў універсітэта мае значныя поспехі ў развіцці прыродазнаўчых навук і іх выкарыстанні ў практыцы.

Так у НДІ ПФП і на кафедры фізічнай оптыкі вядуцца работы па ўдасканаленню тэхналогіі вытворчасці вырабаў мікраэлектронікі і электроннай тэхнікі, сумесна з кафедрай спектраскапіі і квантавай электронікі распрацаваны новыя вадка-крышталічныя рэчывы. Сумесна з кафедрай фізікі цвёрдага цела распрацаваны тэхналагічныя рэжымы іённай імплантацыі пры стварэнні вялікіх і звышвялікіх інтэгральных схем.

На хімічным факультэце і ў НДІ ФХП вынікам даследаванняў у галіне фотахіміі цвёрдых цел з'явіліся распрацаваныя прынцыпова новыя фотаматэрыялы і аднастадыйныя працэсы іх апрацоўкі, якія забяспечваюць атрыманне адлюстраванняў, у тым ліку шматкаляровых, з палепшанымі характарыстыкамі. Прынята рашэнне аб серыйным выпуску гэтых матэрыялаў. Створаны медыцынскія прэпараты на аснове акіслення цэлюлозы, дазволеныя фармакамітэтам Міністэрства аховы здароўя СССР для клінічнай апрабацыі.

Распрацаваны методыкі атрымання высокачыстых рэчываў, укараненне якіх забяспечыла сумарны эканамічны эфект 14,5 млн. руб. (доля БДУ — больш за 3 млн. руб.).

Пэўныя дасягненні маюцца на гістарычным, філалагічным і іншых факультэтах. Вялікая работа праведзена па прапагандзе і навуковаму аналізу творчасці Купалы і Коласа.

Такі дыферэнцыраваны погляд можна было б прадоўжыць па іншых факультэтах і кафедрах.

Яшчэ адзін аспект. Гэта праблема студэнцкіх даследаванняў. Даныя за тры гады неадназначныя. З аднаго боку — працэнт удзелу студэнтаў у навуковых даследаваннях некалькі знізіўся, з другога — узрасла рэзультатыўнасць. Адказ на гэтую супярэчнасць хаваецца ва ўзросшых патрабаваннях і ў нефармальным падыходзе да навуковых даследаванняў студэнтаў. Ілюстрацыяй сказанага можа служыць колькасць рэальных курсавых і дыпломных работ, якая паднялася за справаздачны перыяд з 24 да 29 працэнтаў, павелічэнне ўзнагарод на конкурсах, у тым ліку, па грамадскіх навуках.

„УКОМПЛЕКСЕ ўсіх пытанняў, якімі даводзіцца займацца партыйным камітэтам, кожнай партыйнай арганізацыі,—падкрэсліваў Ю. У. Андропаў на чэрвеньскім (1983 г.) Пленуме ЦК КПСС,— ідэалагічная работа ўсё больш ставіцца на першы план». І гэта невыпадкова. Ажыццяўленне намечаных планаў, рэалізацыя пастаўленых задач у многім вызначаецца ўзроўнем ідэйнай сталасці, працоўнай і сацыяльнай актыўнасці людзей, іх адносінамі да справы.

У гэтай сувязі, як адзначыў дакладчык, павышэнне эфектыўнасці ідэалагічнай, выхаваўчай, прапагандысцкай работы, фарміраванне свядомасці камуністаў і ўсіх членаў нашага калектыву — не толькі задача ідэалагічных работнікаў, але і справа ўсёй партыйнай арганізацыі.

Сістэма ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы ў Белдзяржуніверсітэце ўвогуле адпавядае патрабаванням, што прад'яўляюцца партыяй да якасці падрыхтоўкі спецыялістаў высокай кваліфікацыі.

За справаздачны перыяд партком універсітэта ажыццяўляў кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі, удзяляў першаступенную ўвагу эфектыўнасці выхаваўчых мерапрыемстваў, а таксама ўмацаванню іх арганізацыйнай структуры.

Партком, партыйныя арганізацыі падраздзяленняў абмяркоўвалі і аналізавалі стан партыйнага кіраўніцтва камсамолам. Натуральна, што былі адзначаны недахопы ў рабоце.

Факты сведчаць пра многае станоўчае ў дзейнасці універсітэцкага камсамола. Гэта СБА, ФГП, група «Доўг», паходы па месцах баявой і працоўнай славы, клопат аб ветэранах вайны, дапамога сем'ям загінуўшых, удзел у масавых палітычных маладзёжных мерапрыемствах і многае іншае.

І ўсё ж, партыйным і камсамольскім арганізацыям ёсць над чым працаваць. Прывядзём прыклады: камітэт камсамола выключыў з радоў членаў ВЛКСМ на працягу 1980 — 1983 г.г. 14 чалавек за крадзёж, 15 — за п'янства. Дзе шукаць прычыны гэтых з'яў? У недапрацоўках індывідуальных, у няведанні людзей. у невысокай патрабавальнасці ў камсамольскай акадэмічнай групе. Напрыклад, каля 10 працэнтаў студэнтаў адказалі, што галоўным матывам у актывізацыі вучобы з'яўляецца думка групы.

Мы павінны выказаць шчырую падзяку камуністам і беспартыйным, якія ўкладвалі душу ў ваенна-патрыятычнае выхаванне. Асаблівыя словы ўдзячнасці заслугоўвае наша ветэранская арганізацыя. Многае зрабіла ў гэтай вобласці і наша шматтыражка, калектывы мастацкай самадзейнасці.

Наступныя два гады парткому і партыйным бюро, уліч-ваючы 40-годдзе вызвалення Беларусі і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, патрэбна узмацніць ваенна-патрыятычную работу.

Ідэалагічная работа ў нашым універсітэце мае сваю спецыфіку — навучанне і выхаванне амаль тысячы замежных грамадзян. І трэба сказаць, што пралікаў у гэтай рабоце было дастаткова. Крытыка гаркома партыі і Маскоўскага райкома была справядлівай. Бюро парткома, рэктарат зрабілі правільныя вывады. Намаганні былі засяроджаны на паляпшэнні кіраўніцтва вучэбна-выхаваўчым працэсам, удасканаленні работы з лідэрамі зямляцтваў. У цяперашні час вучэбны працэс са студэнтамі замежных краін забяспечваюць 10 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 40 прафесараў і больш за 200 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

У заключэнні дакладчык заклікаў усіх камуністаў універсітэта памножыць намаганні ў выкананні рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

ПАСТАНОВА

ПАРТЫЙНАЙ СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

ІІІ партыйная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Работу партыйнага камітэта універсітэта прызнаць здавальняючай.

2. Парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям, кіраўнікам падраздзяленняў накіраваць усю арганізатарскую, масава-палітычную работу працоўных калектываў на паспяховае выкананне рашэнняў XXVI з'езда партыі, майскага, лістападаўскага (1982 г.), чэрвеньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, рашэнняў XXIX з'езда КПБ, далейшае ўдасканаленне працэсу прафесійнай падрыхтоўкі і камуністычнага выхавання спецыялістаў.

3. Партыйнаму камітэту, рэктарату, партыйным арганізацыям і кіраўнікам падраздзяленняў пастаянна павышаць эфектыўнасць вучэбнага працэсу, звярнуўшы асаблівую ўвагу на пастаноўку вучэбна-метадычнай работы на кафедрах, якасць лекцый, семінарскіх і практычных заняткаў.

З мэтай забеспячэння адзінства навучання і выхавання студэнцкай моладзі пастаянна павышаць метадалагічную падрыхтоўку выкладчыкаў.

Дабівацца аптымізацыі самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў шляхам рацыянальнага планавання аўдыторнай і пазааўдыторнай работы, арганізацыі бесперапыннага кантролю за бягучай паспяховасцю студэнтаў.

Рэктарату, вучэбнаму аддзелу глыбока прааналізаваць прычыны зніжэння якасці вучобы студэнтаў вячэрняй і завочнай форм навучання і прыняць неабходныя меры па ліквідацыі недахопаў. Вучэбна-метадычнаму цэнтру правесці навукова-практычную канферэнцыю па праблемах узмацнення светапоглядной накіраванасці вучэбнага працэсу.

4. Партыйнаму камітэту, партыйным арганізацыям падраздзяленняў, рэктарату, НДЧ, дырэкцыям навукова-даследчых інстытутаў, дэканатам, кафедрам павышаць эфектыўнасць навуковых даследаванняў, сканцэнтраваўшы асноўныя намаганні на рашэнні важнейшых праблем навукова-тэхнічнага прагрэсу. Дабівацца далейшага павелічэння ўдзельнай вагі важнейшай тэматыкі ў тэматычным плане НДР універсітэта, скарачэння тэрмінаў укаранення навукова-даследчых работ у народную гаспадарку, павышэння эфектыўнасці навуковых даследаванняў па міжвузаўскаму навуковаму супрацоўніцтву, развіцця навукова-даследчай работы студэнтаў.

Забяспечыць далейшую інтэграцыю навуковых даследаванняў у межах вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ — ВА «Інтэграл». Сумесна з адміністрацыяй ВА «Інтэграл» прааналізаваць эфектыўнасць работы ВНВА.

Вывучыць стан навуковых даследаванняў па праблематыцы Харчовай праграмы, вызначыць меры па ўзмацненню ўкладу універсітэта ў яе рэалізацыю.

Рэктарату, парткому прыняць неабходныя меры па павелічэнню аб'ёму НДР, звязаных з вырашэннем эканамічных і сацыяльных задач, што стаяць перад рэспублікай.

5. Удасканальваць ідэалагічную, масава-палітычную работу ў калектыве універсітэта. Парткому, партыйным арганізацыям падраздзяленняў звярнуць асаблівую ўвагу на работу сістэмы марксісцка-ленінскай вучобы, праяўляць больш ініцыятывы ў павышэнні яе эфектыўнасці, унікаць у змест заняткаў, уважліва аналізаваць іх ідэйна-тэарэтычны ўзровень і практычную накіраванасць, кіруючыся пры гэтым рашэннямі чэрвеньскага (1983 г.) Пленума ЦК КПСС аб змене стылю работы сеткі партыйнай асветы. Ідэалагічнаму аддзелу парткома сумесна з праблемнай лабараторыяй сацыялагічных даследаванняў аналізаваць эфектыўнасць работы метадалагічных і тэарэтычных семінараў.

Абагульніць вопыт работы лепшых прапагандыстаў.

6. Партыйнаму камітэту, партгрупам, загадчыкам кафедр грамадскіх навук сканцэнтраваць намаганні прафесарска-выкладчыцкага саставу на павышэнне светапоглядной накіраванасці выкладання сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Шырэй укараняць актыўныя формы правядзення заняткаў, фарміраваць у студэнцкай моладзі класавую свядомасць, актыўную жыццёвую пазіцыю, павышаць палітычную пільнасць студэнцтва.

Загадчыкам кафедр грамадскіх навук, партгрупоргам актывізаваць дзейнасць палітычных дыскусійных клубаў для савецкіх і замежных студэнтаў. Савету кафедр грамадскіх навук у 1984 годзе вывучыць і абагульніць вопыт работы палітычных дыскусійных клубаў.

7. Парткому, партыйным арганізацыям падраздзяленняў забяспечыць далейшае ўдасканаленне масава-палітычнай работы, палепшыць практыку правядзення адзіных палітдзён, палітінфармацый, звярнуўшы асаблівую ўвагу на сувязь мерапрыемстваў з жыццём калектываў падраздзяленняў.

Бюро парткома вывучыць стан вуснай прапаганды ў партыйных арганізацыях універсітэта. Удасканальваць работу шматтыражнай газеты «Беларускі універсітэт», ідэйны і афарміцельскі ўзровень наглядной агітацыі і насценнага друку. Парткому, партыйным і грамадскім арганізацыям, праўленню таварыства «Веды», кафедрам грамадскіх навук прадоўжыць прапаганду палітыкі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, сацыялістычнага ладу жыцця.

8. Парткому, партыйным і грамадскім арганізацыям пастаянна ўдасканальваць ідэйна-палітычнае, працоўнае і маральнае выхаванне студэнцкай моладзі, аналізаваць эфектыўнасць ідэалагічнага ўздзеяння розных форм і метадаў работы.

Партыйным арганізацыям факультэтаў павысіць персанальную адказнасць куратараў, камсамольскіх бюро вучэбных груп за стан маральнага мікраклімату ў студэнцкіх групах. Аддзелу вучэбнай работы парткома абагульніць вопыт работы лепшых куратараў.

Парткому, партыйным арганізацыям факультэтаў, камітэту камсамола прыняць меры па ўдасканаленню практыкі правядзення Ленінскага заліку, грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў.

Партыйным бюро факультэтаў, камітэту камсамола універсітэта, кафедрам грамадскіх навук забяспечыць высокую эфектыўнасць работы факультэта грамадскіх прафесій.

Парткому, рэктарату, партыйным і грамадскім арганізацыям факультэтаў развіваць працоўны рух студэнцтва. Разгледзець на сумесным пасяджэнні бюро парткома і рэктарата вынікі працоўнага семестра 1983 года і распрацаваць мерапрыемствы па ўдасканаленню працоўнага выхавання студэнцкай моладзі.

Павысіць асабістую адказнасць кіраўнікоў, камуністаў, камсамольцаў, усіх членаў калектыву за стан выхаваўчай работы з замежнымі студэнтамі.

Палепшыць маральна-эстэтычнае выхаванне, павысіць выхаваўчую ролю калектываў мастацкай самадзейнасці.

Бюро парткома, рэктарату, грамадскім арганізацыям прадугледзець правядзенне ва універсітэце мерапрыемстваў па прафілактыцы правапарушэнняў.

9. Парткому універсітэта з мэтай павышэння ўзроўню партыйнага кіраўніцтва грамадскімі арганізацыямі, паляпшэння каардынацыі, эфектыўнасці іх работы практыкаваць правядзенне штогадовых семінараў кіраўнікоў грамадскіх арганізацый, заслухоўванне іх справаздач на пасяджэннях партыйнага камітэта, партыйных сходах у падраздзяленнях.

Парткому ў 1984 годзе абмеркаваць работу прафсаюзнага камітэта выкладчыкаў і супрацоўнікаў па развіццю сацыялістычнага спаборніцтва, павышэнню яго выхаваўчай ролі, уздзеяння на выніковыя рэзультаты дзейнасці ўсяго калектыву універсітэта.

Разгледзець на пасяджэннях бюро парткома практыку работы камітэта камсамола універсітэта па інтэрнацыянальнаму выхаванню савецкіх і замежных студэнтаў.

Партыйным і камсамольскім арганізацыям, камітэту ДТСААФ, савету ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны забяспечыць павышэнне ўзроўню ваенна-патрыятычнай і абарончамасавай работы, правядзенне на належным ідэйна-палітычным і арганізацыйным узроўні мерапрыемстваў, прысвечаных 40-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Павысіць ролю фізічнай культуры і спорту ў жыцці калектыву універсітэта, умацаваць матэрыяльную базу фізкультуры і спорту.

10. Рэктарату і бюро парткома да канца 1983 года прааналізаваць стан гаспадарчай і выхаваўчай работы ў інтэрнатах універсітэта і прыняць меры для навядзення належнага парадку.

11. Парткому і яго бюро глыбока аналізаваць стан унутрыпартыйнай работы. Вызначыць меры па павышэнню ролі партыйных сходаў у жыцці калектываў падраздзяленняў універсітэта. Разгледзець на працягу 1984—1985 г. г. пытанні падрыхтоўкі і правядзення партыйных сходаў на філалагічным і біялагічным факультэтах.

12. Парткому універсітэта ўзмацніць метадычную дапамогу партыйным групам, рэгулярна праводзіць вучобу партгрупоргаў.

Заслухаць на пасяджэнні бюро парткома работу партгруп кафедр грамадскіх навук, ІПК і факультэта журналістыкі.

13. Прыняць меры па далейшаму развіццю крытыкі і самакрытыкі, павышэнню яе дзейснасці, вывучэнню грамадскай думкі, заўваг і прапаноў камуністаў.

Правесці семінар сакратароў партыйных арганізацый і намеснікаў па пытаннях развіцця крытыкі і самакрытыкі.

Разгледзець у 1984—1985 навучальным годзе на пасяджэнні бюро парткома пытанне «Аб рабоце партыйнай арганізацыі геаграфічнага факультэта па вывучэнню грамадскай думкі, фарміраванню высокага маральнага клімату ў калектыве».

14. Парткому ўдасканальваць стыль і метады сваёй работы, актывізаваць работу аддзелаў і камісій парткома, павысіць іх узаемадзеянне з партыйнымі арганізацыямі падраздзяленняў, палепшыць унутрыпартыйную інфармацыю. Штогод практыкаваць справаздачы ў партыйных арганізацыях членаў парткома і яго бюро аб праведзенай рабоце.

15. Партыйным бюро падраздзяленняў узмацніць кантроль за праходжаннем кандыдацкага стажу кандыдатаў у члены КПСС, вучобай маладых камуністаў, выкананнем імі партыйных і грамадскіх даручэнняў.

Парткому і яго бюро, пярвічным партарганізацыям больш дакладна ажыццяўляць фарміраванне рэзерву папаўнення радоў КПСС.

У 1984 годзе прааналізаваць практыку работы пярвічных партыйных арганізацый па стварэнню рэзерва папаўнення радоў партыі і прыёму ў члены КПСС.

16. Парткому ўдасканальваць стыль і метады сумеснай работы парткамісіі, камісіі па кантролю за дзейнасцю адміністрацыі, камітэта народнага кантролю.

У 1984 годзе прааналізаваць работу парткамісіі пры парткоме універсітэта.

Прызнаць мэтазгодным стварэнне некалькіх камісій кантролю за дзейнасцю адміністрацыі па важнейшых напрамках вучэбнай, навуковай, выхаваўчай і гаспадарчай работы універсітэта.

17. Парткому прыняць неабходныя арганізацыйныя меры па рэалізацыі ў калектыве універсітэта Закона аб працоўных калектывах. Правесці ў снежні 1983 года канферэнцыю калектыву універсітэта са справаздачай рэктара аб гаспадарчай дзейнасці за мінулы год.

18. У святле патрабаванняў лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС парткому, рэктарату, партыйным арганізацыям падраздзяленняў забяспечыць умацаванне партыйнай і вытворчай дысцыпліны.

З мэтай павышэння персанальнай адказнасці камуністаў за даручаны ўчастак работы практыкаваць вывучэнне стылю і метадаў дзейнасці кіраўнікоў падраздзяленняў, сакратароў партыйных бюро, партгрупоргаў.

ІІІ партыйная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што камуністы, увесь калектыў выкладчыкаў і студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, рабочых і служачых, выконваючы рашэнні XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, прыкладуць усе намаганні, каб паспяхова выканаць задачы, што стаяць перад калектывам па падрыхтоўцы ідэйна перакананых, высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукі і культуры.

ПАРТКОМ УНІВЕРСІТЭТА

НА ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ выбраны новы састаў партыйнага камітэта універсітэта. У яго ўвайшлі: **В. П. Барабанаў, А. І. Баранаў, А. У. Баркоў, Г. А. Браніцкі, П. І. Брыгадзін, А. А. Вечар, М. І. Дзямчук, А. С. Дудар, М. Я. Зайцаў, А. І. Зелянкоў, Л. А. Залатарэвіч, І. П. Зяцькоў, А. С. Каспяровіч, Л. І. Кісялеўскі, А. У. Казулін, В. У. Краснапрошын, А. У. Лабанок, І. В. Марчанка, Д. Б. Мельцар, А. А. Мінько, С. Р. Мулярчык, У. К. Коршук, Л. М. Аўсянка, І. У. Арэхоўская, Л. А. Паўловіч, А. А. Плаўнік, В. А. Прокашава, І. С. Сямыкін, А. Г. Слука, Я. М. Тагуноў, Т. А. Тарасевіч, У. М. Чарнагузаў, А. С. Шуканаў, С. С. Шушкевіч.**

Пасля завяршэння партканферэнцыі адбылося пленарнае пасяджэнне парткома. Сакратаром партыйнага камітэта выбраны **М. І. Дзямчук**, намеснікамі сакратара — **П. І. Брыгадзін, Л. А. Паўловіч.** Членамі бюро парткома выбраны: **Л. М. Аўсянка, Г. А. Браніцкі, П. І. Брыгадзін, М. І. Дзямчук, М. Я. Зайцаў, І. П. Зяцькоў, А. С. Каспяровіч, Л. І. Кісялеўскі, А. У. Казулін, У. К. Коршук, Л. А. Паўловіч.**

НАБЛІЖАЕЦЦА 10 лістапада — Сусветны дзень моладзі. У гэты дзень уся прагрэсіўная моладзь планеты адзначае сваё свята. Ва універсітэце разам з савецкімі студэнтамі рыхтуюцца да яго і навучэнцы з замежных краін. Задача ўсяго калектыву універсітэта і перш за ўсё камсамольскай арганізацыі — данесці да кожнага юнака і дзяўчыны значэнне стварэння Сусветнай арганізацыі дэмакратычнай моладзі, яе мэты і задачы, расказаць аб яе дзейнасці па ўмацаванню радоў дэмакратычнай моладзі, барацьбе за мір.

НА ЗДЫМКУ: дэкан факультэта журналістыкі прафесар П. І. Ткачоў заўсёды знаходзіць час для шчырай гутаркі з замежнымі студэнтамі, што вучацца на факультэце.

СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

Духоўная спадчына Маркса

СЁЛЕТА ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначыла 165 гадоў з дня нараджэння і 100 гадоў з дня смерці вялікага мысліцеля і рэвалюцыянера Карла Маркса. Вывучэнне тэорыі марксізму-ленінізму — жыццёва неабходна для вырашэння нашых практычных задач. Духоўная спадчына Маркса сёння прыцягвае ўвагу барацьбітоў за свабоду і шчасце людзей на ўсіх кантынентах зямлі.

Яшчэ адно пацверджанне гэтаму — навуковая канферэнцыя замежных студэнтаў, што вучацца ў ВНУ г. Мінска, якая прайшла на базе БДУ імя У. І. Леніна. Тэма яе: «Марксісцка-ленінская філасофія як метадалогія навуковага пазнання і рэвалюцыйнага пераўтварэння свету».

— Канферэнцыя, арганізаваная кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў універсітэта, а таксама філасофскімі кафедрамі БПІ і БТІ,— сказаў член аргкамітэта дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Анатоль Ізотавіч Зелянкоў, — падвяла вынікі вялікай і напружанай работы. На працягу ўсяго года ў акадэмічных групах, на курсах, факультэтах мінскіх ВНУ студэнты з розных краін свету выступалі з дакладамі, рэфератамі, навуковымі паведамленнямі, прысвечанымі жыццю і творчасці К. Маркса, уплыву яго ідэй на грамадскае развіццё і лёсы сучаснага свету.

Адкрылася канферэнцыя дакладам «Адзінства партыйнасці і навуковасці ў марксісцка-ленінскай філасофіі», з якім выступіў загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна прафесар В. С. Сцёпін. На канферэнцыі выступалі ў асноўным студэнты II—III курсаў. 11 дакладаў з 16 падрыхтавана замежнымі студэнтамі, што вучацца ва універсітэце. У навуковых паведамленнях студэнтаў з ЧССР, ГДР, В'етнама, Кубы, Нікарагуа, НДРЙ, Афганістана абмяркоўваліся актуальныя праблемы марксісцка-ленінскай філасофіі, раскрывалася яе значэнне для далейшага развіцця навуковага пазнання і рэвалюцыйнай практыкі.

Пры абмеркаванні вынікаў канферэнцыі было адзначана, што ўсе даклады заснаваны на глыбокім вывучэнні першакрыніц, веданні асноў марксізму-ленінізму. У паведамленнях зроблены спробы творчага асэнсавання сучасных працэсаў з пазіцый марксізму-ленінізму. Лепшымі прызнаны даклады студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна Канечны Іваны (навуковы кіраўнік дацэнт А. І. Зелянкоў), Керсцін Хеккендорф і Анет Шэйнбах (дацэнт Я. В. Петушкова), Петры Вольферт (прафесар В. С. Сцёпін), студэнтаў БТІ імя С. М. Кірава Нгуен Ван Шыня (дацэнт Г. М. Мартыненка) і БПІ А. Рэзелер (выкладчык Я. І .Аляксееў).

З. АЛЯШКЕВІЧ,
наш кар.

НА ЗДЫМКАХ: у прэзідыуме навуковай канферэнцыі; уважліва слухаюць студэнты з замежных краін паведамленні сваіх таварышаў.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

«КАМСАМОЛЬСКІ ПРАЖЭКТАР»

АНАЛІЗУЮЧЫ ДАСЯГНУТАЕ

ПА ВЫНІКАХ сацыялістычнага спаборніцтва сярод штабоў «КП» універсітэта у мінулым навучальным годзе «пражэктарысты» юрыдычнага факультэта былі прызнаны пераможцамі. Але нельга сказаць, што ў сваёй дзейнасці мы зрабілі ўсё магчымае. На жаль, штабу «КП» юрфака не заўсёды хапала аператыўнасці, пачуцця рэальнага падыходу да многіх праблем. На некаторых нявырашаных пытаннях хацелася б спыніцца сёння.

Найбольшая колькасць нашых праверак была накіравана на кантроль паспяховасці і вучэбнай дысцыпліны. Тут патрэбна адзначыць такі момант, як цесная сувязь штаба «КП» з вучэбна-выхаваўчай камісіяй. Матэрыялы ўсіх рэйдаў разглядаліся на сумесных пасяджэннях. У большасці выпадкаў гэта вяло да выпраўлення становішча. Але... Пяцікурснік Сяргей Шарко здолеў чатыры (!) разы папрысутнічаць на пасяджэннях штаба «КП» і ВВК.

У мінулым навучальным годзе за сістэматычныя пропускі заняткаў студэнты факультэта Пашкоўскі, Стэфановіч і іншыя былі выключаны з універсітэта. Можна сказаць, што справядлівасць узяла верх, і злосныя парушальнікі атрымалі па заслугах. Так. Але хто з нас задумаўся аб тым, што ў іх паводзінах ёсць і доля нашай віны? Дзяржава выкарыстала нямала сродкаў на навучанне гэтых гора-студэнтаў. Значыць, не змаглі мы яшчэ стварыць атмасферу нецярплівасці да прагульшчыкаў у акадэмічных групах і на факультэце ўвогуле.

Наглядным адлюстраваннем таго, як працуе штаб «Камсамольскага пражэктара» з'яўляецца рэзультатыўнасць рэйдаў. Па выніках усіх праверак састаўляюцца «Маланкі», накіроўваецца матэрыял на рэагаванне. А вось адказы штабу «КП» даводзіцца часам чакаць месяцамі. Няўжо, напрыклад, так цяжка знайсці вольную часіну студсавету і каменданту інтэрната № 4, каб даць адказ штабу «КП»?!

Хочацца спадзявацца, што новы штаб «КП» факультэта ўлічыць цяжкасці, з якімі даводзілася сутыкацца нам.

С. КАРАБЦОВА,
старшыня штаба «КП» юрыдычанга факультэта.

СПРАВАЗДАЧЫ І ВЫБАРЫ Ў КАМСАМОЛЬСКІХ ГРУПАХ. ЧАМУ ЯНЫ НАВУЧЫЛІ?

НАПЕРАДЗЕ — СУР'ЁЗНАЯ ПРАЦА

ВОСЕНЬ — напружаная пара для камітэтаў камсамола універсітэта: пачынаецца падрыхтоўка да справаздачна-выбарных сходаў. У гэтым годзе было прынята рашэнне сумясціць правядзенне справаздач і выбараў з атэстацыяй членаў ВЛКСМ. Што можна сказаць аб выніках справаздачна-выбарнай кампаніі ў групах на нашым механіка-матэматычным факультэце?

Напярэдадні справаздач у многіх групах адбылася папярэдняя атэстацыя, на факультэце былі праведзены заняткі школы камсамольскага актыву. Маляўнічае афармленне аўдыторый, лозунгі і плакаты, кветкі, музыка — усё гэта, безумоўна, стварала ўрачысты настрой. Трэба сказаць, што ў многіх камсамольскіх групах, такіх, як, напрыклад, 8 група 2 курса, справаздачна-выбарныя сходы былі праведзены на самым высокім узроўні. Яны вылучаліся актыўнасцю камсамольцаў, глыбокім аналізам спраў, спрыялі павышэнню якасці ўсёй камсамольскай работы. На сходах выказваліся крытычныя заўвагі ў адрас камітэта камсамола, прымаліся канкрэтныя пастановы па ліквідацыі недахопаў, чаго, на жаль, нельга сказаць аб такіх камсамольскіх арганізацыях, як 12 група 4 курса і 1 група 2 курса, дзе сходы прадэманстравалі нізкі ўзровень падрыхтоўкі, недастатковы кантроль з боку камітэта камсамола.

Да сур'ёзных нашых недапрацовак трэба аднесці і тое, што не ва ўсіх камсамольцаў ёсць добры комплексны план, не дабіліся мы яшчэ, каб камсоргі дакладна ўяўлялі сабе, як лепш арганізаваць адначасовае правядзенне справаздачна-выбарных і атэстацыйных сходаў, недастатковай была работа з камсамольскім актывам, нерэзультатыўнымі заняткі ШКА, нарады з сакратарамі ў камітэце камсамола. Усё гэта прымушае сур'ёзна задумацца. Важна не паўтарыць такіх памылак.

Што можна сказаць цяпер, калі справаздачна-выбарная кампанія ў групах закончана? Правядзенне разам са справаздачамі і выбарамі грамадска - палітычнай атэстацыі ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» цалкам сябе апраўдвае. Трэба толькі адводзіць на падрыхтоўку гэтых мерапрыемстваў больш часу.

Заслугоўвае ўвагі і вопыт камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава, з якім я пазнаёмілася ў Маскве на семінары сакратароў. Шляхам анкеціравання камсамольскі актыў групы мае магчымасць падрыхтаваць разгорнутыя, падрабязныя характарыстыкі на кожнага ўдзельніка Ленінскага заліку, а за адзін-два тыдні да планавага тэрміна схода праводзіцца пасяджэнне камсамольскага бюро групы сумесна з камісіяй па Ленінскаму заліку, дзе, выкарыстоўваючы даныя анкет-характарыстык, даецца аналіз выканання асабістых комплексных планаў, праводзяцца індывідуальныя гутаркі з камсамольцамі, якія маюць спагнанні, зацвярджаюцца праекты характарыстык. Ёсць і іншыя цікавыя прапановы, над якімі варта падумаць. Як бачыце, нашаму камітэту камсамола прадстаіць яшчэ сур'ёзна папрацаваць, каб надаць атэстацыйным і справаздачна-выбарным сходам яшчэ больш прынцыповы і дзелавы характар.

А. ЛІПА,
сакратар камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта.

ЗРАБІЦЬ ПАТРЭБНЫЯ ВЫВАДЫ!

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ атэстацыя ў студэнтаў 2 групы 2 курса геаграфічнага факультэта праходзіла разам са справаздачна-выбарным сходам, і на мой погляд, гэта зусім нядрэнна. Сход пачаўся са справаздачнай прамовы камсорга групы Таццяны Круглені. Звычайна, такія справаздачы — гладкія, поўныя пахвал. А Таццяна напісала аб выніках работы бюро праўдзіва, без выкарыстання «ружовых» фарбаў. Да самых надзённых пытанняў яна падышла адказна, творча, не пабаялася і крытыкі.

Група, дарэчы, не лічыцца лепшай на факультэце. Розныя ёсць тут студэнты. І хіба можна станоўча ацаніць работу, напрыклад, А. Катка, які быў прафоргам групы, але работы ніякай не вёў. Чаму гэта адбылося? Здольнасцей не хапіла? Не ў гэтым справа, проста не жадаў. А таварышы напаміналі, прымушалі працаваць. Многа і такіх студэнтаў, у якіх абставіны зусім крытычныя — вучоба дрэнная, пропускі заняткаў, ніякай актыўнасці ў грамадскім жыцці. Чаму? Можа, яшчэ не прывыклі да студэнцкага жыцця? Але да якой пары будзе раскачка? Другі курс ужо... А можа, і сапраўды цяжка без парады старэйшых увайсці некаторым у патрэбную каляіну? І мне здаецца, што маглі б зайсці да тых, хто яшчэ толькі пачынае сваё студэнцкае жыццё, старшакурснікі. Параіць, прапанаваць, як лепш сумясціць вучобу з грамадскай дзейнасцю, проста паразмаўляць.

Дык што, выходзіць дрэнная гэта група? Зусім не. Былі і агульныя справы, і наладжаны адпачынак, і з вучобай увогуле нядрэнна, таму справядлівымі можна лічыць словы, сказаныя ў заключэнні загадчыкам кафедры псіхалогіі дацэнтам Т. І. Вадэйкам:

— Хочацца верыць, што з усіх заўваг, выказаных тут, камсамольцы зробяць патрэбныя вывады, і гэтая грамадска-палітычная атэстацыя мабілізуе іх на сапраўдную работу

Т. ТРАЦЦЯК.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

3 лістапада 1983 г.

Зак. 1863 АТ 04523

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ